# РЭЦЭНЗІІ

УДК 655.552

## НОВЫЯ ВЫДАННІ АБ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЕ БЕЛАРУСІ

***Федорук А. Т. Старинные усадьбы Гродненщины.*** *Минск : Беларусь, 2014. 543 с.;* ***Трусаў А. А. Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі.*** *Мінск : Харвест, 2015. 464 с.;* ***Голубович А. Г. Белорусский советский плакат.*** *Минск : Беларусь, 2014. 302 с.;* ***Каталог. Афішы да спектакля «Паўлінка» па аднайменнай п'есе Янкі Купалы.*** *Мінск : ДЛМ Янкі Купалы, 2014. 94 с.*

На працягу 15 гадоў А. Т. Федарук падрыхтаваў і выдаў чатыры надзвычай насычаныя цікавымі гістарычнымі фактамі і прадумана аформленыя тамы з серыі «Старажытныя сядзібы Беларусі». У 2000 г. выдадзены першы том «Старинные усадьбы Минского края», які стаў бібліяграфічнай рэдкасцю. У 2004 г. выйшаў том «Старинные усадьбы Берестейщины», перавыдадзены ў 2006 г. Па словах аўтара, з 1967 г. ён вывучае сядзібы Гродзеншчыны. Вынікам гэтай працы стала выданне ў 2013 г. тома, прысвечанага сядзібам Карэліцкага раёна, а ў 2014 г. – першага тома «Старинные усадьбы Гродненщины», у якіх разглядаюцца сядзібы сямі раёнаў (згодна з алфавітам: ад А да І). Нам здаецца важным той факт, што выданне ажыццёўлена па заказе музея «Замкавы комплекс Мір», дырэктар якога з'яўляецца навуковым рэдактарам гэтага тома.

У «Весніку БДУКМ» (2007) апублікавана рэцэнзія на першыя дзве кнігі, і мы палічылі магчымым прадоўжыць традыцыю. Не будзем падрабязна спыняцца на характарыстыцы зместу апошніх тамоў, адзначым толькі, што кожны зацікаўлены чытач знойдзе для сябе мноства звестак аб фарміраванні сядзібных комплексаў, архітэктурных стылях, ландшафтным дызайне 270 сядзіб. Іх культурна-гістарычная значнасць заключаецца не толькі ў бляску і ўвасабленні шляхецкай культуры і традыцый, але і ў спалучэнні духоўных і інтэлектуальных каштоўнасцей, выпрацаваных пакаленнямі ўладальнікаў.

У большасці выпадкаў падрабязна падаецца радавод уладальнікаў, апісваюцца іх дзейнасць і роля ў сацыякультурным жыцці рэгіёна, дасягненні ў гаспадарчым развіцці. Цікавымі для студэнтаў музейнай спецыяльнасці могуць стаць звесткі аб наяўнасці сямейных калекцый – нумізматычных, кніжных і інш., захаванні фамільных каштоўнасцей і рэліквій. Сустракаюцца гістарычныя мініяцюры, напрыклад, аб маёнтку Балценікі (Воранаўскі р-н), дзе пражывалі Вавжынец Путкамер і Мары-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ля Верашчака. Цікава расказваецца аб маёнтку Шаўры і яго ўласніках – Нарбутах, лёсе прадстаўнікоў гэтай сям'і і інш.

Важнымі з пункту гледжання аховы гісторыка-культурнай спадчыны з'яўляюцца звесткі аб сучасным стане. Аўтар указвае, напрыклад, «все строения утеряны», «сохранились здания хозяйственного двора», «костел и усадьба содержатся в образцовом состоянии» (Гнёзна, Ваўкавыскага р-на), «заслуживает большего внимания по сохранению и благоустройству» (Скідзель) і г. д. Праўда, ён не ставіць задачу раскрыцця працэсу музеефікацыі сядзіб, што дае магчымасць для далейшых даследаванняў.




Кніга «Старинные усадьбы Гродненщины» выклікае станоўчае ўражанне яшчэ і таму, што, у параўнанні з папярэднімі, адавочнай з'яўляецца лепшая захаванасць гісторыка-культурнай спадчыны на Гродзеншчыне. Хаця і тут не ўсё так добра, бо 111 сядзіб згублена, захаваліся ў сваіх межах толькі 20 сядзіб, 47 сядзібных дамоў. З чатырох палацаў – у Свяцку, Дзятлаве, Гродне (палац Валіцкага), Жамыслаўі, у самым дрэнным стане апошні. Аўтар звяртае ўвагу на недаацэнку гісторыка-культурнага значэння сядзіб, іх ролю ў сучасным сацыякультурным развіцці рэгіёнаў, што выразна адлюстроўваецца ў выніках рамонтных работ, якія змяняюць сядзібныя дамы да непазнавальнасці.




Кніга кандыдата гістарычных навук, дацэнта А. А. Трусава «Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі», безумоўна, можа быць карыснай для выкладчыкаў і студэнтаў, настаўнікаў, усіх, хто любіць Беларусь. У багата ілюстраваным выданні можна знайсці тлумачэнне прынцыпаў архітэктурнай кампазіцыі, прасачыць эвалюцыю архітэктурных стыляў, даведацца пра канструкцыйныя асаблівасці, напрамкі архітэктуры ад першабытнага да сучаснага грамадства, што вельмі важна пры выкладанні курса «Гісторыя архітэктуры».

Кніга пабудавана па храналагічным прынцыпе і адпавядае прынятым у гістарычнай навуцы перыядам. Змястоўная частка кнігі надзвычай дакладна суадносіцца з адукацыйнымі задачамі. Аўтар настолькі прадумаў методыку падачы тэксту, падабраў адпаведны ілюстрацыйны матэрыял, у многіх выпадках вельмі рэдкі, што кніга можа выконваць і ролю дакладнага даведніка. Апошняе нам падаецца вельмі важным, таму што ў спецыяльнай літаратуры сустракаюцца недакладнасці, неадпаведнасці, розначытанні. Да кнігі А. А. Трусава могуць звяртацца прадстаўнікі розных галін ведаў, навучэнцы, тыя, хто цікавіцца родным краем, і кожны знойдзе шмат карыснага.

Дастаткова складана раскрываць праблемы станаўлення і развіцця савецкага грамадства, і прычына не ў недахопе крыніц, дакументаў, фактаў. У мностве разнастайнага матэрыялу цяжка вылучыць знакавы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

элемент, які б увасобіў характэрныя рысы эпохі. Для будучых музейных работнікаў вельмі важна зафіксаваць увагу на канкрэтных падзеях праз выразныя сродкі. Дапаможнікам для дасягнення падобнага эфекту можа стаць навуковае выданне «Беларускі савецкі плакат», аўтарам якога з'яўляецца кандыдат мастацтвазнаўства А. Г. Галубовіч. Кніга выйшла ў выдавецтве «Беларусь» у 2014 г. і яе афармленне можа стаць прыкладам высокага паліграфічнага мастацтва.




У выкладанні гісторыі Беларусі савецкага перыяду, асабліва для будучых музейных супрацоўнікаў, кніга А. Г. Галубовіч мае несумненнае значэнне як асаблівая ілюстрацыя эпохі. Важным з'яўляецца і тое, што частка кантрольных экзэмпляраў плакатаў, выкарыстаных аўтарам, захоўваецца ў фондах Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальнага гістарычнага музея, Пінскага музея Беларускага Палесся і інш. У кнізе прадстаўлена да 300 плакатаў з калекцыі Г. М. Галубовіча – вядомага мастака, навукоўцы, калекцыянера і бацькі аўтара, якому яна і прысвячае сваю працу.

Прэзентацыя плакатаў прапанавана ў храналагічным парадку, асноўная частка прысвечана пасляваеннаму перыяду. Уражвае важная акалічнасць: пераважная большасць плакатаў на беларускай мове. Мастацкае выкананне плакатаў мы не кранаем, гэта задача мастацтвазнаўцаў, але іх сюжэты таксама здзіўляюць прадуманасцю, шматпланавасцю, выразнасцю, дакладнасцю, што робіць іх даступнымі для разумення. Дадатковы штрых дадаюць лаканічныя, але ёмістыя надпісы. Напрыклад, на плакаце 1947 г. невядомага аўтара «БССР. За гады савецкай улады» паведамляецца: Беларуская ССР ператварылася ў індустрыяльна-калгасную краіну, з высокаразвітой сацыялістычнай культурай і навукай». Па выявах на гэтым плакаце можна правесці экскурсію. Тое ж можна сказаць і аб плакаце А. М. Чуркіна «Савет эканамічнай узаемадапамогі – важны фактар умацавання адзінства і згуртаванасці садружнасці сацыялістычных дзяржаў» (с. 122). Шмат карыснай інфармацыі нясуць плакаты Л. В. Чурко «Брыгадны падрад», «Сапраўдны творца», «Сустрэчны план» (с. 136–138); плакат А. М. Чуркіна «Праграма міру» прысвечаны рашэнням XXIV з'езда КПСС (с. 140), яго тэкст дазваляе раскрываць знешнюю палітыку СССР перыяду разрадкі міжнароднай напружанасці.

З другой паловы 1980-х гг. стыль і змест плакатаў выразна змяняюцца. З'яўляюцца плакаты, прысвечаныя беларускай нацыянальнай ідэі і яе носьбітам, напрыклад, работа У. У. Васюка «…Людзі, дзе нарадзіліся і ўзгадаваліся, да таго месца вялікую ласку маюць» (с. 216). Вельмі выразны сваёй нерухомасцю сюжэт плаката К. У. Хацяноўскага «Перестройка!» (с. 248).

У якасці падсумавання адзначым, што ў кнізе А. Г. Галубовіч можна знайсці плакаты па разнастайных гістарычных падзеях: выбары ў саветы розных узроўняў, барацьба за мір, святкаванне юбілейных і памят-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных дат і інш. Многія з іх можна выкарыстоўваць не толькі як мастацкую, але і змястоўную ілюстрацыю па гісторыі савецкага перыяду.




Адной з удалых, на наш погляд, спроб сродкамі мастацкага плаката адзначыць 90-гадовы юбілей Янкі Купалы, з'яўляецца работа Р. С. Маліноўскага «1882–1972» (с. 128). На плакаце паказаны асноўныя творы народнага паэта, што безумоўна, дапамагае ўявіць маштаб яго творчасці. Мы згадалі аб гэтым плакаце, каб сказаць некалькі слоў пра каталог «Афішы да спектакля "Паўлінка" па аднайменнай п'есе Янкі Купалы», складзены з афіш уласных фондаў і выдадзены Дзяржаўным літаратурным музеем Янкі Купалы ў 2014 г. Каталог працягвае серыю каталогаў, выдадзеных музеем за апошняе дзесяцігоддзе: «Рукапісная спадчына Янкі Купалы», «Аўтографы першага народнага паэта Беларусі Янкі Купалы», «"Ты гэтых вачэй не забудзь…" Фатаграфіі Янкі Купалы». Гэтыя выданні сведчаць, што музей актыўна працуе ў галіне навукова-даследчай і навукова-фондавай дзейнасці.

Афішы пададзены ў храналагічным парадку (з 27 студзеня 1913 г. па 2013 г.). Для музейнага спецыяліста яны цікавы знешнім выглядам, зместам, а таксама інфармацыяй, якой насычана кожная афіша, а ўсіх іх каля 40. Для кожнага зацікаўленага чытача, а не толькі спецыялістаў – гісторыкаў, філолагаў, мастацтвазнаўцаў, рэжысёраў, акцёраў, будзе карысным азнаёміцца з тэкстамі, якія суправаджаюць афішы.

Такім чынам, кожнае з прадстаўленых выданняў мае дачыненне да адукацыйнай і музейнай дзейнасці. Іх можна актыўна выкарыстоўваць пры выкладанні адпаведных гістарычных і музеязнаўчых дысцыплін. Важнае значэнне мае і тое, што выкарыстаны шматлікі ілюстрацыйны матэрыял захоўваецца ў музейных фондах, супрацоўнікі музеяў з'яўляліся ініцыятарамі і складальнікамі некаторых выданняў. Безумоўна, любое з разгледжаных выданняў будзе карысна і цікава як выкладчыкам, так і студэнтам усіх спецыяльнасцей універсітэта, усім, хто цікавіцца гісторыяй і культурай роднай краіны.

***М. А. Бяспалая***
*доктар гістарычных навук, прафесар*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ